*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 КАСТРЫЧНІКА 2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 200 (26065)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Беларусь зацікаўлена ў супрацоўніцтве з Японіяй

Беларусь зацікаўлена ў супрацоўніцтве з Японіяй і гатова актывізаваць узаемадзеянне з гэтай дзяржавай, якая дынамічна развіваецца. Аб гэтым заявіў 18 кастрычніка кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю японскаму інфармацыйнаму агенцтву «Кіода Цусін».

Японамоўная служба навінаў «Кіода Цусін» супрацоўнічае амаль з усімі друкаванымі і электроннымі СМІ Японіі, агульная аўдыторыя якіх цяпер перавышае 50 млн чалавек. Працуе таксама англамоўная служба навінаў, паслугамі якой на аснове падпіскі карыстаюцца сродкі масавай інфармацыі большасці краін свету, а таксама міжнародныя арганізацыі, уключаючы СГА, МВФ і іншыя.

У «Кіода Цусін» працуюць амаль 1000 журналістаў і фатографаў. Больш як 100 журналістаў на пастаяннай аснове працуюць у замежных прадстаўніцтвах агенцтва, у асноўным у Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне, Паўночнай Амерыцы і Еўропе.

У час інтэрв'ю было закранута шырокае кола тэм, у тым ліку тыя, якія датычацца стану і перспектыў развіцця беларуска-японскіх адносінаў, магчымасцяў супрацоўніцтва дзвюх краін у сферы атамнай энергетыкі, рэакцыі Беларусі на планы ЗША па разгортванню элементаў ПРА ў Чэхіі і Польшчы, верагоднасці размяшчэння на беларускай тэрыторыі ядзерных узбраенняў у адказ на планы Злучаных Штатаў стварыць ракетны шчыт ва Усходняй Еўропе.

Кіраўнік дзяржавы таксама адказаў на пытанні наконт узаемаадносінаў улады і апазіцыі ў Беларусі, інтэграцыйных працэсаў з Расійскай Федэрацыяй, ваеннага супрацоўніцтва з Кітаем, узаемадзеяння з НАТА.

Паводле вынікаў 2006 года аб'ём гандлю паміж Беларуссю і Японіяй склаў $147 млн (рост у 2,3 раза ў параўнанні з 2005 годам). За студзень—жнівень 2007 года таваабарот перавысіў $160 млн.

У структуры беларускага экспарту асноўнае месца займаюць сухое малако, інтэгральныя мікрасхемы, шкловалакно, аптычныя і вымяральныя інструменты, лазеры, лінзы. З Японіі ў Беларусь пастаўляюцца аўтамабілі, апаратура для сувязі, фотакапіравальныя машыны, аўтапагрузчыкі, дарожная тэхніка, машыны для аўтаматычнай апрацоўкі інфармацыі.

«Мы ў бліжэйшай перспектыве будзем вельмі актыўна дзейнічаць на японскім напрамку. І мне здаецца, што Японія адкажа тым жа. Таму што ёй выгадна супрацоўнічаць з намі і выкарыстоўваць Беларусь як плацдарм у цэнтры Еўропы для эканамічнай экспансіі на Захад і ў іншыя дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт.

Дзяржаўныя і грамадскія структуры Беларусі і Японіі актыўна ўзаемадзейнічаюць у пытаннях пераадолення наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. У Японіі на рэгулярнай аснове праходзяць навучанне і стажыроўкі ўрачы, інжынеры і спецыялісты з медыцынскіх установаў Беларусі. У 2004 годзе ініцыявана работа па двух праектах, звязаных з аснашчэннем медыцынскай тэхнікай бальніц у пацярпелых беларускіх рэгіёнах. Беларусь і Японія ажыццяўляюць навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва па лініі Міжнароднага навукова-тэхнічнага цэнтра, заснаванага ЗША, Японіяй, Фінляндыяй і Еўрапейскім саюзам у 1992 годзе. Падтрымліваюцца рэгулярныя кантакты беларускіх і японскіх вучоных, спецыялістаў па распрацоўцы перспектыўных двухбаковых праектаў і праграм, накіраваных на мінімізацыю наступстваў чарнобыльскай катастрофы, уключаючы лячэнне пацярпелага насельніцтва і сістэматызацыю медыцынскіх даных.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## РЭАЛЬНАЯ ЗАРПЛАТА ЗА ЖНІВЕНЬ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ НА 0,4 ПРАЦЭНТА

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені—жніўні гэтага года склала Br679 тыс. Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу, у жніўні сярэдняя зарплата была роўная Br737 тыс. Гэта на 0,7 працэнта больш (на Br5 тыс.), чым у ліпені гэтага года.



Фота БЕЛТА.

## НОВАЕ СВЯТЛО СТАРОГА ЛІХТАРА

У Брэсце пад адкрытым небам ствараецца музей ліхтароў. КУП «Брэстгарсвятло» плануе зрабіць цэлую алею старадаўніх ліхтароў на вул. Фаміных горада Брэста. Ідэя стварэння экспазіцыі належыць дырэктару прадпрыемства «Брэстгарсвятло» Сяргею Авадовічу. На тэрыторыі гэтага прадпрыемства дзесяцігоддзямі складзіруюцца ліхтары, якія адслужылі свой век. Цяпер лепшыя з іх стануць экспанатамі незвычайнага музея.

НА ЗДЫМКУ: **Анатоль ТРАНЦЮК** аднаўляе старыя ліхтары.

## Віншуем, калегі!

За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай журналістыкі, рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, шматгадовую плённую творчую дзейнасць шасцёра звяздоўцаў узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Шчыра віншуем Ілону Іванову, Таццяну Падаляк, Віктара Пазнякова, Сяргея Протаса, Людмілу Рыжанкову, Вікторыю Целяшук. Новых творчых здзяйсненняў, калегі!

**Звяздоўцы.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЦАНА РАСІЙСКАГА ГАЗУ ДЛЯ БЕЛАРУСІ НА 2008 ГОД БУДЗЕ ЎСТАНОЎЛЕНА Ў СНЕЖНІ

**Цана расійскага газу для Беларусі на 2008 год будзе ўстаноўлена ў снежні гэтага года, паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Сурыкаў на прэс-канферэнцыі ў Мінску.**

Паводле яго слоў, кошт тысячы кубаметраў газу будзе набліжаны да $125 — так складваецца кан'юнктура расійскага рынку. «У адпаведнасці з кантрактам, падпісаным Беларуссю і Расіяй, цана газу для Беларусі павінна складаць 67 працэнтаў ад сярэднееўрапейскай цаны», — сказаў Аляксандр Сурыкаў. Ён адзначыў, што праблем у працэсе фарміравання паліўна-энергетычнага балансу Беларусі і Расіі цяпер няма. У наступным годзе Расія пастаўць Беларусі 21,6 млрд куб.м газу — на 300 млн куб.м больш, чым у 2007 годзе.

### У ААН АФІЦЫЙНА ДАДЗЕНЫ СТАРТ МІЖНАРОДНАМУ ГОДУ БУЛЬБЫ

**У зале Эканамічнага і Сацыяльнага Савета ў штаб-кватэры ААН у Нью-Йорку ўчора быў афіцыйна дадзены старт Міжнароднаму году бульбы.**

Генеральная Асамблея ААН у снежні 2005 года прыняла рашэнне аб абвяшчэнні 2008 года Міжнародным годам бульбы па рэкамендацыі Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (ФАА). Рэспубліка Беларусь як вядомы ў свеце вытворца бульбы стала адным з саўтараў гэтай рэзалюцыі Генасамблеі.

**Кар. БЕЛТА.**

### ПРАДАЕЦЦА... СВІДРАВІНА

Ва Ушацкім раёне 12 лістапада пройдзе аўкцыён па продажы свідравіны мінеральнай вады, паведаміў намеснік старшыні Ушацкага райвыканкама Уладзімір Аўдошка. Стартавая цана лота складзе Br140 млн. Запасы вады дазваляюць будаваць перспектыўныя планы ўзвядзення бальнеалагічнага санаторыя.

**БЕЛТА.**

### ПОЎНЫ «ДНЕПР» ГАРЭЛКІ

**Амаль 500 літраў кантрабанднай гарэлкі ўкраінскай вытворчасці затрымалі пінскія памежнікі пры садзейнічанні мясцовага насельніцтва.**

Як паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце, украінскую гарэлку ўвезлі двое грамадзян суседняй краіны на «Запарожцы» і матацыкле «Днепр» з люлькай. Абодва транспартныя сродкі не мелі рэгістрацыйных нумароў.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### ХАБАРНЫ МАРКЕТЫНГ

**Хочаце атрымаць свае грошы... плаціце хабар.**

Прыкладна такі ўльтыматум паставіў перад прадстаўнікамі аднаго закрытага акцыянернага таварыства намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу Мінскага завода шасцерняў. Каб вярнуць больш за 36 мільёнаў рублёў, якія памянёнае прадпрыемства павінна было пералічыць на рахунак фірмы за пастаўленую прадукцыю, кіраўніцтва фірмы прыняло карупцыйную прапанову. Паводле звестак Генеральнай пракуратуры, нядобрасумленны намеснік атрымаў хабар у памеры 4 тысяч долараў і трапіў у рукі супрацоўнікаў праваахоўных органаў. А нядаўна адбыўся суд, які прыгаварыў хабарніка да 6 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## ПРАДСТАЎНІЦТВА ТЭЛЕРАДЫЁВЯШЧАЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ — У МІНСКУ



Прадстаўніцтва тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы (ТРА Саюза) адкрылася ў Мінску 18 кастрычніка. ТРА Саюза пачала вяшчанне ў тэставым рэжыме з 25 верасня. Аб гэтым паведаміў старшыня арганізацыі Ігар Угольнікаў на адкрыцці прадстаўніцтва ў Мінску. Тэлеканал вяшчае 16 гадзін у суткі. Асноўнай задачай будзе напаўненне эфіру якасным прадуктам, у тым ліку ўласнай вытворчасці.

НА ЗДЫМКУ: **Ігар УГОЛЬНІКАЎ** прадстаўляе лагатып канала.

**Фота Генадзя ЖЫНКОВА, БЕЛТА.**

Спажыўкааперацыя

## РОБІМ СТАЎКУ НА... ПАРЭЧКІ?

**Малы ўраджай яблыкаў і ў той жа час някепскія зборы з бульбяных палеткаў — такімі аказаліся вынікі 2007 года. Абедзве гэтыя акалічнасці напрамую адбіліся на сёлетніх аб'ёмах нарыхтовак і ўзроўні закупачных цэнаў.**

За сёлетнія студзень—верасень спажывецкая кааперацыя здолела нарыхтаваць сельгаспрадукцыі ў насельніцтва амаль на 100 млрд рублёў, або на суму, што атрымалася па выніках усяго мінулага года. Дарэчы, як адзначыў начальнік упраўлення нарыхтовак і знешнеэканамічнай дзейнасці Белкаапсаюза Уладзімір Гапановіч, як і раней, праблем са своечасовымі разлікамі за здадзеныя «лішкі» не было. А вось што да закупачных цэнаў, то яны «паводзілі» сябе па-рознаму.

Калі летась агульны аб'ём нарыхтовак яблыкаў у краіне склаў 126 тыс. тон, то сёлета з-за неўраджаю гэты паказчык аказаўся ўдвая меншым. У сваю чаргу гэта паўплывала на закупачныя цэны. У 2006 годзе здаць кілаграм яблыкаў можна было за 70, у лепшым выпадку за 100 рублёў, тады як сярэдняя цана ападу сёлета выйшла на 350, а таварнага яблыка — перавысіла адзнаку ў 1000 рублёў.

Апроч таго, значна «набралі вагу» чарніцы. З улікам канкурэнцыі з боку прыватнікаў кошт іх кілаграма на працягу сезона ўзрос з 4 да 6 тыс. рублёў. Да таго ж ёсць усе падставы меркаваць, што высокая планка тут захаваецца і ў будучыні.

Тым часам сезон нарыхтовак працягваецца. Менавіта зараз ідзе актыўная здача морквы і капусты (у залежнасці ад рэгіёнаў цана на іх вагаецца ў межах 350—500 руб.), буракоў (250—350 руб.), а таксама бульбы (270—330 рублёў за кілаграм). Пры гэтым не выключана, што кошт той жа бульбы будзе ўзрастаць бліжэй да зімы. Аднак пры ўмове спрыяльнай кан'юнктуры на знешніх рынках.

Зноў-такі сітуацыя ў Расіі і Малдове вызначыць і канчатковыя аб'ёмы закупак. Пакуль жа сітуацыя тут далёка не аптымістычная. На сённяшні бульбы нарыхтавана 22,5 тыс. тон — гэта практычна поўная патрэба для закладкі на зіму і рэалізацыі праз гандлёвую сетку ў Беларусі. Тым часам паводле ацэнак, сёлета насельніцтва зможа прапанаваць на продаж прыкладна 300—400 тыс. тон бульбяных «лішкаў». І ці атрымаецца накіраваць такія аб'ёмы на экспарт — яшчэ пытанне. Бо даводзіцца канстатаваць: рэальна традыцыйныя краіны-імпарцёры маюць больш танныя і якасныя прапановы. Праўда, заўважыў Уладзімір Гапановіч, сёлета ў тую ж Расійскую Федэрацыю ўсё ж удалося адгрузіць 4,8 тыс. тон «другога хлеба», у той час як летась пастаўкі бульбы сюды знізіліся амаль да нулявой адзнакі.

Між тым, калі сітуацыя з бульбай у нечым нагадвае «крызіс перавытворчасці», то некаторыя іншыя віды сельгаспрадукцыі наадварот знаходзяцца ў дэфіцыце. У прыватнасці, айчынныя прадпрыемствы маюць вострую патрэбу ў парэчках, чарнаплоднай рабіне, сельдэрэі, шпінаце. Прычым, заўважыў Уладзімір Гапановіч, налета менавіта на гэтыя перспектыўныя з пункту гледжання кан'юнктуры рынку культуры варта звярнуць увагу ўладальнікам прыватных гаспадарак і фермерам.

**Сяргей ГРЫБ.**

Канферэнц-зала

## МАК — ТОЛЬКІ Ў БУЛАЧКАХ

**У Беларусі неўзабаве будзе забаронены продаж макавага зерня на рынках**



«Макавая наркамафія» ў хуткім часе адчуе дэфіцыт сыравіны для вытворчасці опію. Як паведаміў начальнік упраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі МУС краіны Алег Пякарскі, беларускім урадам неўзабаве будзе прынята спецыяльная пастанова аб фактычным увядзенні дзяржаўнай манаполіі на рэалізацыю макавага зерня. Плануецца, у прыватнасці, забараніць продаж маку на рынках і ў іншых камерцыйных установах. Прадстаўнік МУС запэўніў, што аматары булачак з макам не застануцца без свайго ласунку. Рэалізацыяй гэтага прадукту для буйных і дробных хлебапёкаў будуць займацца дзяржаўныя прадпрыемствы. Алег Пякарскі патлумачыў, што макавая манаполія будзе ўведзена дзеля таго, каб пазбавіць вытворцаў опію крыніц сыравіны. Менавіта з макавага зерня, якое пакуль яшчэ знаходзіцца ў вольным продажы, у Беларусі апошнім часам вырабляюцца наркотыкі ў падпольных лабараторыях.

Яшчэ адной пастановай Савета Міністраў мяркуецца перакрыць шлях наркотыкам у месцы пазбаўлення волі. Справа ў тым, што нярэдка на адрас беларускіх «зэкаў» ад невядомых «дабрадзеяў» прыходзяць пасылкі і бандэролі, у якіх супрацоўнікі Дэпартамента па выкананні пакаранняў знаходзяць наркатычныя рэчывы. Таму ўрад плануе крыху змяніць правілы аказання паштовых паслуг. Калі адпаведная пастанова ўступіць у сілу, то пасылка ў «месцы не надта аддаленыя» будзе прымацца супрацоўнікам аддзялення сувязі толькі пасля прад'яўлення дакумента, які пацвярджае асобу адпраўніка. Такім чынам людзям, якія займаюцца перасылкай наркотыкаў у турмы і зоны, ужо не ўдасца пазбегнуць адказнасці.

Дарэчы, у Палацы прадстаўнікоў знаходзіцца праект закона, які, у выпадку прыняцця, істотна ўзмоцніць крымінальную адказнасць за незаконны абарот наркотыкаў, а таксама сыравіны і прыладаў для іх вырабу. Распрацоўшчыкі прапануюць увесці паняцце «асабліва небяспечныя наркатычныя сродкі і псіхатропныя рэчывы», каб правасуддзе мела магчымасць больш сурова караць вытворцаў і распаўсюджвальнікаў гэтай «атруты». Цяпер за злачынствы, звязаныя з абаротам наркотыкаў, у месцах пазбаўлення волі знаходзяцца амаль 3 тысячы чалавек, з якіх больш за 400 — жанчыны. Гэтыя «сейбіты кайфу» зламалі лёс дзесяткам тысяч чалавек. Паводле слоў галоўнага ўрача Мінскага гарадскога наркалагічнага дыспансэра, толькі ў сталіцы афіцыйна на ўліку (рэальная колькасць наркаманаў прыкладна ў 10 разоў большая) знаходзяцца 4300 нарказалежных асобаў, з якіх 80 працэнтаў людзі ва ўзросце да 30 гадоў. Наркаманія ў сталіцы імкліва бярэ ў палон моладзь. Яшчэ 10 гадоў таму сярод мінскіх наркаманаў толькі 4—5 працэнтаў былі ва ўзросце да 20 гадоў. А зараз ужо кожны пяты аматар кайфу не дасягнуў памянёнага ўзросту. У моладзевым асяроддзі найбольшай папулярнасцю карыстаюцца псіхатропныя рэчывы, якія трапляюць у Беларусь пераважна з Польшчы і Літвы. Зрэшты, адмысловыя падпольныя лабараторыі ствараюцца і ў нашай краіне. Сёлета, напрыклад, было выяўлена сем такіх «фабрык смерці». Толькі ў Мінску за дзевяць месяцаў гэтага года ад «перадазіроўкі» памерлі 13 наркаманаў.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## Зацверджаны новыя закупачныя цэны на малако

**Уступілі ў сілу новыя закупачныя цэны на малако. Нагадаем, яны былі павялічаны на 10 працэнтаў. Апошні раз у сувязі з істотным падаражаннем матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў для сельскагаспадарчых прадпрыемстваў закупачныя цэны на малако, згодна з рашэннем урада, павялічваліся на 5 працэнтаў з 1 верасня.**

Як паведамілі рэдакцыі «Звязды» ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, цяпер закупачная цана аднаго літра малака складае: вышэйшага гатунку — 480 рублёў (дагэтуль было 435 рублёў), першага гатунку — 440 рублёў (400 рублёў), другога гатунку — 270 рублёў (250 рублёў). Закупачная цана на негатунковае малако, як і ў перадапошні раз, не павялічвалася і засталася на ўзроўні 140 рублёў за літр. «Трэба павялічваць якасць прадукцыі, якая здаецца, а пры транспарціроўцы негатунковага малака гэтыя выдаткі перавышаюць кошт самой прадукцыі. Навошта на яе павялічваць цану?» .

Ад насельніцтва малако рэкамендавана закупляць па цане, не ніжэйшай за першы гатунак, г.зн. па 440 рублёў за літр. Як зазначылі ў міністэрстве, новыя закупачныя цэны найперш станоўча адаб'юцца на кішэні малаказдатчыкаў. Пакупнікі ў магазінах асаблівай розніцы адчуць не павінны, паколькі, каб гэта адбылося, трэба адначасова істотна павялічваць адпускныя і рознічныя цэны. Яны, вядома ж, на месцы не стаяць, аднак іх рост у бліжэйшыя месяцы складзе два-тры працэнты.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

**ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует, что с 22 октября 2007 года снижаются процентные ставки как по вновь выдаваемым, так и по ранее выданным физическим лицам кредитам в белорусских рублях на потребительские нужды и финансирование недвижимости на общих основаниях.**

**Более подробную информацию относительно получения кредитов и оказания банком других услуг можно получить в любом учреждении ОАО «АСБ Беларусбанк» или на веб-сайте банка**

**www.belarusbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НІКАЛЯ САРКАЗІ РАЗВЁЎСЯ З ЖОНКАЙ

**Прэс-служба Елісейскага палаца ў чацвер афіцыйна пацвердзіла інфармацыю аб разводзе прэзідэнта Францыі Нікаля Сарказі і яго жонкі Сесіліі.**



У абнародаванай заяве адзначаецца, што пара вырашыла разысціся «па ўзаемнай згодзе» і не будзе даваць з гэтай нагоды больш ніякіх каментарыяў. Прычыны разводу застаюцца невядомымі.

### ФРАНЦЫЮ ПАРАЛІЗАВАЛА ЗАБАСТОЎКА ТРАНСПАРТНІКАЎ

**У Францыі 18 кастрычніка прайшла найбуйнейшая за апошнія 12 гадоў забастоўка дзяржаўных служачых грамадскага транспарту, у якой бяруць удзел машыністы метро, прыгарадных і рэгіянальных цягнікоў, а таксама вадзіцелі аўтобусаў.**

Забастоўка арганізавана ў адказ на намер урада правесці рэформу пенсійных ільгот і паэтапна павялічыць у 2012 годзе тэрмін выхаду на пенсію для дзяржслужачых з 37,5 да 40 гадоў. З 700 хуткасных паяздоў, якія штодня адпраўляюцца з Парыжа ў рэгіёны, на лініі засталіся ўсяго 46. У гэтай сувязі вельмі дарэчы прыйшлася нядаўна ўведзеная ў эксплуатацыю сістэма муніцыпальных веласіпедаў, якімі за плату можа скарыстацца кожны. Праўда, да сямі раніцы на стаянках не засталося і гэтага транспарту.

### ЭСТОНСКІМ ШКОЛЬНІКАМ РЭКАМЕНДАВАНА СМЯЯЦЦА НАД НЕГРАМІ

**Міністэрства адукацыі Эстоніі адобрыла для выкладання дзецям 12—13 гадоў гумарыстычныя зборнікі, сумніўны характар жартаў якіх выклікаў непаразуменне з боку бацькоў. Сямікласнікам прапаноўваецца пасмяяцца над фразамі накшталт: «Чаму неграў хаваюць у труне з дзвюма ручкамі? Таму што ў сметніц заўсёды дзве ручкі» і «Што агульнага ў жанчыны і цыгарэты? Перад спажываннем і тое, і другое трэба памяць». Прапануюцца падобныя «жартачкі» і ў адносінах да некаторых іншых нацыянальнасцяў.**

Пра тое, што такі гумар рэкамендаваны для вывучэння падлеткам, выпадкова даведаўся работнік сферы адукацыі Анатоль Купрыяновіч, дачка якога вучыцца ў адной з самых элітных школ Таліна, паведамляе «МК-Эстония». На запыт выдання адносна рэкамендаваных зборнікаў міністэрства адукацыі Эстоніі прысла адказ, згодна з якім «з фармальнага пункту гледжання праблемы няма, паколькі названыя зборнікі ўнесены ў спіс толькі рэкамендаванай літаратуры».

МТБанк
МИНСКИЙ ТРАНЗИТНЫЙ БАНК

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

**на 1 октября 2007 года**

Наименование банка:

**ЗАО «Минский Транзитный Банк», г. Минск**

*в миллионах белорусских рублей*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2007 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 12 893,5 | 9 222,7 |
| 3 | Средства в Национальном Банке РБ | 1102 | 2 | 13 094,0 | 8 474,8 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | | 36 613,0 | 23 183,3 |
| | для торговли | 11031 | 3 | 0,0 | 0,0 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3,1 | 3 000,0 | 0,0 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3,2 | 33 613,0 | 23 183,3 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 5 539,5 | 20 627,5 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 155 058,7 | 83 779,8 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | 0,0 | 0,2 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 5 198,8 | 3 916,2 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 5 343,6 | 6 783,6 |
| 10 | **ИТОГО активы** | **110** | | **233 741,1** | **155 988,1** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального Банка РБ | 1202 | 9 | 0,0 | 0,0 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 47 964,7 | 25 014,1 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 131 183,3 | 88 253,0 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 5,0 | 0,2 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 9 438,0 | 5 746,0 |
| 17 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **188 591,0** | **119 013,3** |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 20 334,0 | 20 334,0 |
| 20 | Эмиссионные разницы | 1212 | | 0,0 | 0,0 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 5 083,5 | 5 083,5 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 17 877,4 | 10 386,5 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 1 855,2 | 1 170,8 |
| 24 | **Всего капитал** | **121** | | **45 150,1** | **36 974,8** |
| 25 | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **233 741,1** | **155 988,1** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | 91 049,1 | 47 896,0 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | 57 473,0 | 38 765,4 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ

**на 1 октября 2007 года**

*в миллионах белорусских рублей*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2007 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 15 394,9 | 9 084,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 7 933,8 | 4 261,4 |
| 3 | **Чистые процентные доходы** | **201** | **18** | **7 461,1** | **4 822,9** |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 9 726,6 | 8 157,4 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 1 115,1 | 805,0 |
| 6 | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | **19** | **8 611,5** | **7 352,4** |
| 7 | **Чистый доход по операциям с иностранной валютой** | **203** | **20** | **6 405,9** | **4 127,2** |
| 8 | **Чистый доход по операциям с ценными бумагами** | **204** | **21** | **-58,0** | **-87,5** |
| 9 | **Доход в форме дивидендов** | **205** | | **0,0** | **0,0** |
| 10 | **Чистые отчисления в резервы** | **206** | **22** | **963,7** | **751,5** |
| 11 | **Прочие доходы** | **207** | **23** | **479,3** | **441,9** |
| 12 | **Операционные расходы** | **208** | **24** | **12 470,6** | **8 862,2** |
| 13 | **Прочие расходы** | **209** | **25** | **1 023,6** | **731,4** |
| 14 | **Налог на прибыль** | **210** | | **1 997,7** | **1 518,8** |
| 15 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **6 444,2** | **4 793,0** |

Руководитель — А.К. Жишкевич
Главный бухгалтер — В.В. Ермолович

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 13 от 27.10.2006 г.*

*З пачатку 2007 года ў Мінскім транзітным банку (МТБанку) паспяхова рэалізуюцца дзве спецыялізаваныя праграмы для прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнэсу, а таксама ІП. Усяго за паўгода з моманту падпісання пагаднення з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця МТБанкам былі асвоены 4 млн долараў па Праграме падтрымкі МСП. Некалькі соцень ІП і невялікіх прадпрыемстваў атрымалі крэдыты на развіццё па спрошчанай схеме. Зараз банк працягвае дадзеную праграму за кошт уласных сродкаў.*

*Аказалася запатрабаванай кліентамі і пакетная прапанова «З намі лягчэй». Сутнасць гэтай праграмы — у прадастаўленні прадпрыемствам, якія пачынаюць работу з МТБанкам, шэрагу істотных скідак на банкаўскае абслугоўванне.*

*У сённяшніх эканамічных рэаліях абедзве праграмы могуць быць цікавыя для ІП, якія праходзяць перарэгістрацыю.*

### КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.10.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 150,00 |
| 1 еўра | 3 064,39 |
| 1 латвійскі лат | 4 358,84 |
| 1 літоўскі літ | 887,49 |
| 1 чэшская крона | 111,49 |
| 1 польскі злоты | 827,40 |
| 1 расійскі рубель | 86,43 |
| 1 украінская грыўня | 425,74 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 24,8749 |
| 10 UAH | 49,2446 |
| 1000 BYR | 11,5583 |
| EUR | 35,4194 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 18.10.2007 г.)*

USD ........ 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпісвайцеся на часопіс «Галоўны бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

ISSN 1990 - 763X

07200>

9 771990 763008

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

19
КАСТРЫЧНІКА
2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 43 (15494)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Акцыі

# ЮНЫЯ БЕЛАРУСЫ ЗАЦІКАВІЛІСЯ ЭКАЛАГІЧНАЙ ПРАБЛЕМАЙ



У рамках міжнароднай экалагічнай ініцыятывы дзіцячага тэлеканала Jetix у Рэспубліканскім экалагічным цэнтры дзяцей і юнацтва адбыўся фінал конкурсу «Прыбяры сваю краіну». Арганізатарамі таксама сталі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства інфармацыі, тэлекамунікацыйны галіновы саюз і Рэспубліканскі экалагічны цэнтр дзяцей і юнацтва.

Конкурс «Прыбяры сваю краіну» праходзіў у Беларусі ўпершыню, а яго тэмай стала перапрацоўка пластыкавых бутэлек, бо праблема перапрацоўкі пластыкавых адходаў зараз адна з самых актуальных у свеце. Удзел у конкурсе ўзялі 400 дзяцей і падлеткаў ад 7 да 16 гадоў з усёй Беларусі. Пераможцамі ж сталі ажно трыццаць школьнікаў (з Любані, Лагойска, Вілейкі, Дзятлава, Прылукаў і Мінска). Ім уручылі пуцёўкі ў дзіцячы аздараўленчы лагер «Зубраня» і сувеніры. Былі не толькі індывідуальныя праекты, але і групавыя работы дзяцей з экалагічных гурткоў і цэнтраў. Акцыя, на думку арганізатараў, звярнула ўвагу на праблему экалогіі і адначасова на развіццё творчага патэнцыялу юных жыхароў Беларусі, бо яны праявілі ўсю сваю фантазію.

**Ірына ПРЫМАК.**

Выпрабавана на сабе

# ПРАЦА ДОМА

Памятаю, як яшчэ ў школе, у 10-м класе мне на вочы патрапіла наступная аб'ява: «Офіс дома. У Вас ёсць жаданне зарабляць рублі і валюту? Займацца нескладанай працай дома? Мець надзейную працу з высокім і стабільным заробкам? Мець магчымасць, не кідаючы асноўнай працы, падзарабляць па 3—4 гадзіны ў дзень? У кароткі тэрмін палепшыць сваё матэрыяльнае становішча, сумяшчаючы некалькі варыянтаў прац? Мы дапаможам Вам ажыццявіць усе гэтыя жаданні! Супрацоўніцтва з беларускімі, расійскімі і замежнымі кампаніямі. Завочныя працы з штотыднёвай аплатай не патрабуюць якіх-небудзь адмысловых ведаў, досведу або практычнай падрыхтоўкі. Магчымая як поўная, так і частковая занятасць...». Ну, чым не казка з залатымі гарамі на гарызонце! Яшчэ тады мне, школьніку, вельмі спадабалася гэтая аб'ява, напісаў ліст з просьбай падрабязней распавесці аб працы. На што мне прыйшоў даволі-такі хутка адказ. Прычым, з Расіі, з горада Тулы.

Так, пасланне здзівіла сваёй інфарматыўнасцю. Перада мной быў спіс з 34 варыянтаў заробку. Вочы проста разбягаліся: паштовая праца, апрацоўка допісу на даму, выраб візітовак, праца з замежнымі калекцыянерамі, паштовы агент дома, склейванне паштовых канвертаў, зборка караляў, фасоўка насення і склейванне пакетаў для фасоўкі, сакратар дома... Выбар, сапраўды, быў вялікі. Прычым гэта далёка не поўны спіс. А якая заработная плата: 300 тысяч, 2000$ у месяц, 150 тысяч у тыдзень... Усё залежала ад занятасці, дзесьці ад аб'ёму выкананай працы... А ў адным з пунктаў была прапанаваная надомная праца на міжнароднае агенцтва. Праца заключалася ў аналізе прэсы, допісаў, выкананні часовых або разавых даручэнняў. Арыентаваны заробак вагаўся ад 2000 долараў і вышэй. А для асобаў з гуманітарнай адукацыяй была спецыяльная адмысловая прапанова: выкананне агенцкіх відаў прац, з камандзіроўкамі. Зарплата ад 6000 долараў.

Ну ўсё, здавалася, пара кідаць школу. Тут такія грошы круцяцца, а мне трэба сядзець вучыць матэматыку, мовы...

Але як стала вядома потым, тут усё не так ужо гладка і перспектыўна, як можа здацца на першы погляд. Гэта я зразумеў тады, калі пасля прапанаванай працы прачытаў наступную інфармацыю: «Вы можаце прыступіць да працы неадкладна, у дзень атрымання пакета інструкцый. Для гэтага неабходна занесці ўступную суму: на множанне і падрыхтоўку неабходных дакументаў для пачатку працы. Вы атрымаеце значныя скідкі, калі закажаце матэрыялы адразу па некалькіх пунктах. Кошт замовы інфармацыі па адным пункце — 5 тысяч беларускіх рублёў...». Для ахвотнікаў атрымаць інфармацыю больш чым па адным пункце рабіліся скідкі. Чым больш замоў, тым танней атрымліваўся адзін пункт. Гаварылася, што сваёй аплатай мы пацвярджаем сур'ёзнасць намераў. Гэтым выключалася бяздзейная цікаўнасць.

Было жудасна цікава пазнаць, што сабой уяўляе праца, якая прапаноўвалася. Да таго ж, грошы былі абяцаныя немалыя. Трохі падумаўшы, прыйшоў да высновы, што варта паспрабаваць свае сілы ў гэтай працы. Схадзіў на пошту, зрабіў перадаплату, адправіў ліст з канвертам са зваротным адрасам. Натуральна, зрабіў замову адразу па некалькіх пунктах (так было нашмат танней!). Праз тыдзень мне прыйшоў адказ. Ліст быў тоўстым, было зразумела, што там шмат папер. Аказалася, што я маю рацыю. З нецярпеннем адкрыў ліст, і з прагнасцю стаў чытаць яго змест.

### Праца па распаўсюджванні інфармацыі

Сутнасць працы заключалася ў распаўсюджванні рознай інфармацыі сярод зацікаўленых асобаў за аплату. Яна звязаная з атрыманнем лістоў па рэкламных аб'явах, іх апрацоўкай і перасыланнем патэнцыйным кліентам. Спачатку трэба было падабраць тую інфармацыю, якая карысталася б найбольшым попытам, напрыклад, рэцэпты і замовы народнай медыцыны, карысныя парады і цікавыя тэхналогіі... Самае галоўнае, што да «падбору інфармацыі трэба падыходзіць творча». Затым трэба было размножыць гэтую інфармацыю (пры дапамозе ксеракса), затым размясціць рэкламу для прыцягнення патэнцыйных пакупнікоў. Потым ужо трэба было працаваць з допісам, дакладней з замовамі, якія прыйшлі да вас.

У канцы пазначалася: «Магчыма, Вам здалося занадта складаным выкарыстоўваць дадзеную методыку, але грошы проста так нікому не даюцца, іх трэба зарабіць. Вы не пашкадуеце, калі возьмецеся за гэтую працу».

### Методыка паштовай працы

Было прапанавана некалькі варыянтаў працы, так або інакш звязаных з дзейнасцю па пошце. Адна праца заключалася ў тым, каб арандаваць у любым паштовым аддзяленні паштовую скрыню і здаваць у сваю чаргу якому-небудзь бізнэсмену. Яшчэ адна праца заключалася ў продажы па пошце газет прадпрымальнікам і фірмам іншых гарадоў і рэгіёнаў. Гаварылася, што шматлікія зацікаўленыя ў рэгулярным атрыманні цэлых газет або асобных рубрык. Але для гэтага трэба спачатку было знайсці патэнцыйных пакупнікоў, апублікаваўшы ў газетах рэкламныя аб'явы.

### Дробны гандаль па пошце

Для ажыццяўлення гэтай дзейнасці трэба было вывучыць рынак збыту і высветліць тое, што ў іншых рэгіёнах з'яўляецца дэфіцытам або на што кошт значна вышэй, чым у нас у горадзе. «Дэфіцытны» тавар, не вельмі аб'ёмны, трэба было б закупіць (насенне, напрыклад), размясціць аб'яву і потым ужо займацца продажам.

### Завочныя курсы

Пры наяўнасці вызначаных ведаў можна арганізаваць кансультацыю па пошце або завочныя курсы замежнай мовы, рамонту тэлевізараў, гульні на гітары... Але для гэтага варта разбірацца ў той сферы, якую выкладаеш.

Але гэта яшчэ не самае галоўнае. Супертройка лідараў прапануемай працы яшчэ наперадзе.

### Праца па склейванні канвертаў

Для выканання гэтай працы спачатку трэба было атрымаць узор канверта-нарыхтоўкі, які трэба было выразаць з контурнай лініі, затым склейваць... Але самае галоўнае наперадзе. Потым гэтыя ж канверты трэба было самім прадаваць сваім знаёмым, блізкім, прапаноўваць у аддзяленні сувязі, у рэдакцыі газет, на аптовыя базы... Выдатны спосаб заробку.

### Зборка шарыкавых аўтаручак і фламастараў дома

Гэтая надомная праца ўяўляла зборку простых шарыкавых аўтаручак і фламастараў. Спачатку неабходна было замовіць сыравіну (натуральна за грошы), а таксама 5 працэнтаў ад неабходнай сумы адправіць пасрэдніцкай арганізацыі. Пасля аплаты высылалася праца. У канцы ліста былі напісаныя наступныя словы: « Увага! Усе паштовыя пераводы, дасланыя на фірмы Украіны, абкладаюцца 30-працэнтным падаткам: нам нявыгадна афармляць прыём пераводаў. Вашы даныя і грошы ўкладзіце ў канверт са зваротным адрасам, добра заклейце і адпраўце нам... Падман цалкам выключаны. Мы працуем для Вас».

### Праца па склейванні караляў дома

Прапаноўвалася нескладаная высокааплатная праца па зборцы караляў дома. Для таго каб прыступіць да працы, трэба было скласці кантракт з прадпрыемствам на 3 месяцы. На працягу гэтага часу трэба выконваць абумоўлены кантрактам аб'ём працы. Пасля заканчэння тэрміну кантракта вам выплачваліся б заробленыя грошы. Ваш заробак залежаў бы ад якасці і колькасці выкананай працы. Не факт, што Вам заплацілі б усе грошы.

У рэшце рэшт я не ўзяўся за выкананне ні адной з прапануемых прац. Уся гэтая праца вельмі сумнеўная. Перасыланнем грошай па пошце займаюцца толькі ненадзейныя кампаніі. Бо гэта ўхіленне ад падаткаў, што з'яўляецца парушэннем закона. А за гэта можна патрапіць у месцы не гэтак аддаленыя.

Такія аб'явы трапляліся мне на вочы яшчэ неаднаразова. Але я, навучаны горкім вопытам, не звяртаў на іх ніякай увагі.

**Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

Наш фармат

# ГУЛЬНЯ З РАЗМАХАМ

**Ёсць гульні, якія патрабуюць спецыяльных уменняў і доўгіх трэніровак — а ёсць дэмакратычныя, адкрытыя абсалютна для ўсіх. Да іх ліку належыць і КВЗ — сваіх «вясёлых і знаходлівых» выяўляюць школьнікі і настаўнікі, ваеннаслужачыя і офісныя работнікі, фізікі і лірыкі, і нават... манахі, атрымаўшы адпаведнае блаславенне.**

Таму нікога не здзіўляе, што ў КВЗ гуляюць у калоніях. Цеснае супрацоўніцтва Беларускага клуба вясёлых і знаходлівых, Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства адукацыі пачалося з 1999 года — каманда «СімпліСіці» (г. Віцебск) упершыню прыняла ўдзел у таварыскай гульні з камандай папраўчай калоніі № 2 г. Бабруйска. З 2004 года праект стаў штогадовым — пазней да вясёлых і знаходлівых далучыліся беларускія артысты эстрады — Улада, Андрэй Дзяркоў, Алеся, Уладзімір Ухцінскі, Ларыса Грыбалёва, якія выступалі ў калоніях з канцэртамі. Аднойчы «каланісты» нават удзельнічалі ў агульным чэмпіянаце і, нягледзячы на тое, што арганізатарам давялося паклапаціцца аб дадатковай бяспецы, пакінулі вельмі цёплыя ўражанні ў журы і гледачоў. Маса станоўчых водгукаў з абодвух бакоў — і творчая акцыя «Восеньскі марафон» атрымлівае статус традыцыйнай — паводле слоў старшыні праўлення БелКВЗ Андрэя Мукавозчыка, магчыма нават, што адзін з выпускаў музычна-забаўляльнай праграмы «Вось дык шоў!» будзе зняты ў калоніі.

А 19 кастрычніка адбудзецца чарговы матч зборнай ігракоў беларускага КВЗ — і каманды УА «Магілёўскае дзяржаўнае спецыяльнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча закрытага тыпу №2». У якасці гледачоў запрошаны таксама выхаванцы Магілёўскай спецшколы закрытага тыпу, а ўвечары адбудзецца канцэртная праграма ў папраўчай калоніі № 15 г. Магілёва. 26 лістапада БелКВЗ рыхтуецца адзначыць юбілей — як мяркуецца, гэта будзе Суперкубак з удзелам самых вядомых каманд — зборных БДУ 1-га і 2-га склікання, разанскага «Чарнакніжніка», «Ізноў 25», дзеючых чэмпіёнаў «V.I.P.». Адмовілася ад удзелу пакуль што толькі каманда «ЧП», ды і з ёю ідуць перамовы. Беларускія «зоркі» — выхадцы з КВЗ таксама парадуюць гледачоў сюрпрызамі, якія, напрыклад, Ларыса Грыбалёва і Пётр Елфімаў рыхтуюць ужо зараз.

Акрамя таго, у святочны дзень будуць падведзены вынікі акцыі «Дзіця КВЗ». Са сталічнымі радзільнымі дамамі ёсць дамоўленасць, паведаміць, дзе і калі 26 лістапада народзіцца першае немаўля. Яно — а дакладней, уся шчаслівая сям'я — атрымае на студзеньскім фестывалі КВЗ ад спонсараў важкі прыз, грашовы або рэчыўны, а таксама іменны абанемент на ўсе гульні КВЗ на 20 бліжэйшых гадоў... «Не важна, будзе гэта хлопчык ці дзяўчынка, блізняты ці трайняты — галоўнае, што дзіця вырасце з пачуццём гумару, наш чалавек будзе», — лічыць Андрэй Мукавозчык.

Тым часам, дарэчы, працягваецца конкурс на новы лагатып Беларускага КВЗ. На мастацкае спаборніцтва, абвешчанае яшчэ ў чэрвені бягучага года, паступіла 55 работ, але большасць з іх не задаволілі журы. Для 2 тура адабралі 6 работ, аўтарам якіх перадалі пажаданні па дапрацоўцы ідэй, а 1 тур вырашылі падоўжыць — да 20 кастрычніка. Калі ў вас спалучаюцца талент мастака і пачуццё гумару — паспрабуйце, можа, новы сімвал КВЗ прыдумаеце менавіта вы?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# У ШКОЛУ ВЕРНЕЦЦА «ЧАРЧЭННЕ»?

**Выкладчыкі тэхнічных ВНУ выказваюць незадаволенасць адменай выкладання ў агульнаадукацыйных школах чарчэння. Сёння частковa веды па гэтым прадмеце школьнікі атрымліваюць на ўроках матэматыкі, інфарматыкі і тэхналогіі.**

Наколькі эфектыўная такая замена, можна меркаваць хоць бы па выніках здачы студэнтамі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта экзамену па інжынернай графіцы: з першай спробы гэты прадмет здаюць толькі 60 працэнтаў студэнтаў, 6 працэнтаў студэнтаў увогуле яго не здаюць, а астатнія — толькі з другой ці трэцяй спробы. У моладзі, якая паступае на тэхнічныя спецыяльнасці, зусім не развіта прасторавае мысленне, канстатуюць у БНТУ, і гэта з'яўляецца адным з наступстваў адмены выкладання ў школе прадмета «Чарчэнне».

У сувязі з такімі абставінамі па даручэнні міністра адукацыі нашай краіны будзе створана рабочая група, у якую плануецца ўключыць выкладчыкаў ВНУ, якія валодаюць камп'ютарнай графікай, настаўнікаў тэхнічнай працы, майстроў прафесійна-тэхнічнай адукацыі і іншых спецыялістаў, каб дасканала прааналізаваць і даць аргументаваны адказ, ці ёсць неабходнасць вярнуцца да выкладання ў школе прадмета «Чарчэнне», і калі ёсць такая неабходнасць, то за кошт чаго і якім чынам гэта можна зрабіць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Студгарадок

# Дыпламаваныя маці РАЗБУРАЮЦЬ СТЭРЭАТЫПЫ,

## або Дзеці студэнтаў — самыя разумныя

**Ці можна сумяшчаць паспяховую вучобу ў прэстыжнай ВНУ з нараджэннем і выхаваннем дзетак? У БДУ ўпэўнены — не толькі можна, але і трэба! У гэтым перакананы рэктар Васіль Стражаў. Студэнты падтрымліваюць кіраўніцтва як у тэорыі, так і на практыцы: маці-студэнтак і аспірантак у БДУ нямала. З якімі цяжкасцямі ім даводзіцца сустракацца, чым дапамагае дзяржава і alma-mater, мы даведаліся падчас свята "Верым у вечнасць мацярынства".**

**15 маладых маці атрымалі віншаванні і карысныя парады. Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны краіны Марыяна Шчоткіна і намеснік старшыні Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман Дапіра распавялі дзяўчатам, куды звяртацца ў складаных сітуацыях, нагадалі пра належныя маці-навучэнцы ВНУ льготы і дапамогі. А ўдзельніцы Мінскага міжнароднага клуба жонак паслоў і дыпламатаў падзяліліся вопытам выхавання дзяцей. Да цёплых слоў і падарункаў прыклалася яшчэ і грашовая дапамога — універсітэт перавядзе на рахункі матуль па сто тысяч на кожнае дзіця.**

### Дачка спаць — маці за кандыдацкую

Алена (*вельмі прасіла не называць прозвішча, баіцца рэакцыі мужа-ваеннага*), аспірантка факультэта міжнародных адносінаў, нарадзіла дачку на чацвёртым курсе, праз тры дні пасля здачы экзаменаў:

— Стаўленне выкладчыкаў само спрыяльнае для паспяховай здачы, але да экзамену рыхтавацца цяжэй, больш хвалюешся. У акадэмічны не пайшла, адразу паступіла ў аспірантуру, але пасля першага года была вымушана ўзяць адпачынак па догляду дзіцяці. Пакуль яно зусім маленькае, да 6-7 месяцаў, займацца дысертацыяй яшчэ можна, а далей узнікае столькі пытанняў, што галава кружыцца. Першы год у садку дзеці адаптуюцца, часта хварэюць... Бабуля і мама прыязджалі з Расіі, дапамагалі.

***(Заканчэнне на 2-й стар «ЧЗ».)***

# ТЫ — СТАРАСТА!



**Старасты-першакурснікі вучэбных груп усіх факультэтаў БДУ пабывалі на выязным адукацыйным семінары «Ты — староста!» 16—17 кастрычніка ў САК «Брыганціна», што пад Радашковічамі.**

На працягу гэтых двух дзён супрацоўнікі Белдзяржуніверсітэта разам са старшакурснікамі вучылі больш за 250 маладых і «зялёных» старастаў складанай і тонкай навуцы — быць сапраўдным лідарам сваёй групы і моцным праваднікоm паміж студэнтам і дэканатам. Старасты-першакурснікі не толькі паслухалі лекцыі пра структуру ўніверсітэта і правы і абавязкі студэнтаў, але і паспрабавалі свае сілы ў спецыяльных псіхалагічных трэнінгах. Напрыклад, на адным з іх трэба было «выцягнуць» патрэбную інфармацыю са старога і зануднага выкладчыка, які гутарыць больш не па тэме, паразмаўляць з намеснікам дэкана, заваленага ўласнымі праблемамі, і дабіцца свежай інфармацыі ад супрацоўніцы дэканата, якой, вядома ж, і справы няма да нейкага там старасты групы першакурснікаў.

Варта сказаць, што маладыя людзі не разгубіліся і даказалі сабе і іншым, што старастамі іх выбралі зусім не выпадкова. Акрамя таго, студэнты на імправізаванай прэс-канферэнцыі з удзелам рэктара БДУ Васіля Стражава мелі магчымасць задаць любое пытанне, а такіх, дарэчы, за два месяцы вучобы ва ўніверсітэце назбіралася даволі шмат: ад будаўніцтва новых інтэрнатаў і факультэтаў да арганізацыі вучэбнага працэсу. Як зазначыў рэктар БДУ В. Стражаў, «зараз сапраўды бачна, што вы ўжо не абітурыенты, а сапраўдныя студэнты БДУ — нашай вялікай, але дружнай універсітэцкай сям'і».

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# ПЕРАМАГЧЫ СВАЕ ТАБУ Ў СІЛАХ ТЫ, І Я ЗМАГУ

**У Японіі быў распаўсюджаны звычай даваць маладым, якія збіраліся ажаніцца, «пасцельную кніжачку». Яна ўяўляла сабой томік з каляровымі малюнкамі, якія адлюстроўвалі ўсе падрабязнасці палавых зносінаў. Дзякуючы гэтай «энцыклапедыі кахання», бацькі пазбягалі няёмкай сітуацыі, у якой ім давялося б тлумачыць сваім дзецям інтымныя падрабязнасці сам-насам. Між тым, сёння падобную інфармацыю можна знайсці на любой кніжнай паліцы. Сэкс больш не з'яўляецца сур'ёзным табу. На якія звесткі, у такім выпадку, накладзена забарона? Вызначыць месца табу ў грамадстве ў цэлым і ў сваёй свядомасці ў прыватнасці на працягу года спрабавалі ўдзельнікі міжнароднага маладзёжнага абмену паміж Германіяй, Беларуссю і Францыяй.**

### Біблейскія табу — святое

— Штогод моладзь Беларусі ўдзельнічае ў падобных праектах, — расказвае старшыня «Лігі добраахвотнай працы моладзі» Вольга Шмігельская. — Мы цесна супрацоўнічаем як з Германіяй, так і з Францыяй. Таму няма нічога дзіўнага, што нас запрасілі ўзяць удзел у чарговым абмене. Тэма гэтага абмену была далёкай і блізкай адначасова. Згадзіцеся, пра табу ніхто з нас не думае суткамі напралёт, але забароны трывала, быццам п'яўкі, прысмакталіся і сядзяць у свядомасці кожнага.

Абмен складаўся з трох частак (кожная доўжылася сем дзён). Першая — тэарэтычная — праходзіла восенню мінулага года ў Берліне. Усе тры краіны былі ў аднолькавым становішчы. Ніхто дакладна не мог сфармуляваць паняцце табу. Таму абкладіся тлумачальнымі і этымалагічнымі слоўнікамі розных аўтараў і шукалі дыфініцыі. Пасля такой карпатлівай працы ўдзельнікі абмену суаднесілі розныя азначэнні і выводзілі свае.

— На такіх семінарах заўсёды ўздымаюцца актуальныя тэмы, над якімі ў будзённым жыцці мала хто задумваецца, — адзначае каардынатар праграмы «Міжнародныя валанцёрскія праекты» Яраслаў Алейнік. Напрыклад, на адным з падобных абменаў разбіраліся з паняццем талерантнасць. Гэты тэрмін многія разумеюць як цярпімасць. Але, насамрэч, гэта не так. Талерантны чалавек не церпіць, а проста прызнае права іншых дзейнічаць так, як сярод іх прынята. Вось і атрымліваецца, што цярплівых людзей дастаткова, а талерантных трэба яшчэ пашукаць.

Табу — тэма, на мой погляд, вельмі актуальная. У нашым грамадстве шмат забаронаў. Але я лічу, што ў большасці сваёй яны непатрэбныя. Мы самі ж іх накладваем на сябе. Вось і атрымліваецца, што чалавек, змяшчаючы сябе ў рамкі, абмяжоўвае не толькі свае дзеянні, але і думкі. Упэўнены, што кожны павінен прытрымлівацца дзесяці запаветаў, запісаных у Бібліі. Імі ні пры якіх абставінах нельга грэбаваць. А ўсе астатнія абмежаванні — асабісты выбар кожнага.

### Снег і снегавік — таксама цуды свету... для французаў

Другі этап абмену праходзіў мінулай зімой у нашай краіне. Усе ўдзельнікі праекта мелі магчымасць раней наведаць як Францыю, так і Германію. Але ў Беларусі, акрамя саміх прадстаўнікоў беларускага боку, была толькі адна дзяўчына. Таму акцэнт рабілі на знаёмстве з краінай.

— Колькі радасці было, калі французы пераходзілі па лёдзе Свіслач. Дарослыя людзі, а крычалі, як дзеці, — усміхаецца Яраслаў.

— У «Лізе» нашы госці заўважылі мяккую цацку-снегавіка, — дадае Вольга. — Ніколі ў жыцці жыхары паўднёвай Францыі да гэтага не бачылі ні снегу, ні снегавіка. Французы не выпускалі снежнага чалавечка з рук. Так ён стаў татэмам нашай краіны. І пасля, на трэнінгах ці агульных размовах, мы перадавалі снегавіка разам з правам голасу адзін аднаму. Калі мы паехалі ў Францыю, на завяршальны этап абмену, прыхапілі цацку з сабой. Усе вельмі абрадаваліся. Снегавік у другі раз стаў паўнапраўным членам нашага абмену: ён і фатаздымкі рабіў, і глядзеў іх пасля. Паехала нас з Беларусі ў Францыю сямёра, а вярнуліся з папаўненнем — французы падарылі брацiка для снегавіка.

### Табу генацыду пад музыку Вагнера

Вынікам абмену стаў апошні практычны этап, які на днях прайшоў на поўдні Францыі, у Каркасоне.

— Там мы працавалі з фаташопам, вучыліся правільна рабіць фатаздымкі. Раней я проста фатаграфаваў, не ведаў, як правільна пабудаваць кампазіцыю, як карыстацца правілам залатога сячэння. Зараз, безумоўна, да прафесіянала мне далёка. Але фатаздымкі сталі атрымлівацца на ўзровень лепшымі.

Наогул, французы, большасць з якіх прафесійна займаецца фатаграфіяй, былі ўпэўнены, што з задумкі нічога не атрымаецца. Думалі, што як мінімум кожная група прэзентуе па адной працы. Але, насуперак іх чаканням, амаль кожны прадстаўнік групы прадэманстраваў на выставе свой асабісты калаж.

— Яшчэ на першым этапе семінара нас папярэдзілі, што трэба будзе паказаць сваё разуменне табу ў выглядзе фатаздымкаў, — удакладняе Яраслаў. — Многія рыхтаваліся дома. У мяне ж, шчыра прызнацца, не было на гэта часу. Тым больш, якраз напярэдадні апошняга этапу трэба было ехаць на трэнінг у Крым. Самае складанае для мяне было асэнсаваць тэму, прыдумаць арыгінальную ідэю. А тэхнічная частка не заняла шмат часу. Француз Эрык, прафесійны фатограф, даступна ўсё патлумачыў. Калі ўзнікалі пытанні, дапамагаў. Шчыра прызнацца, прыемна было адчуць сябе мастаком.

Паводле слоў Вольгі, работы былі наколькі рознымі, настолькі крэатыўнымі. Адзін накладваў лічбы (свой узрост і дату нараджэння) на сімвалічныя фатаздымкі, якія потым развесіў на сцяне. Другі свой калаж, пры дапамозе якога паказаў, што адзінота з'яўляецца вынікам менавіта табу, размясціў на лесвічнай пляцоўцы. Беларуска пры дапамозе фатаздымкаў выступіла супраць генацыду. Яна арыгінальна падышла да сваёй работы: прэзентавала свой калаж пад музыку Вагнера (гэтага кампазітара, як вядома, любіў Гітлер).



Выстава праходзіла ў памяшканні, якое перадаў муніцыпалітэт асацыяцыі «Граф» (гурток, які займаецца фатаграфіяй). Мэр суседняй вёскі, што знаходзіцца ля Каркасона, вітаў усіх у выставачнай зале.

— Уладальнік жа галерэі сучаснага мастацтва быў здзіўлены, калі ўбачыў нашы працы. «Вы ж толькі аматары. А фатаздымкі не адрозніш ад работ прафесіянала». Ён папрасіў дазволу выстаўляць фотакалажы ў сваёй галерэі. Нам таксама хацелася б, каб гэтыя працы змаглі ўбачыць як немцы, так і беларусы. Але ёсць праблемы з перасылкай: гэта не вельмі танна. У любым выпадку мы пастараемся вывесіць пры ўваходзе ў «Лігу» хоць бы працы беларускіх удзельнікаў праекта.

### Карысць семінара нельга ацаніць

Тры тыдні маладыя людзі з розных сацыяльных пластоў, з рознымі поглядамі і выхаваннем абмяркоўвалі адну тэму. Удзельнікі абмену лічаць: вельмі добра, што семінар расцягнуўся на цэлы год. Быў час падумаць, зрабіць грунтоўныя вынікі.

— Акрамя таго, што разбіраліся з паняццем табу, мы знаёміліся з культурай і нацыянальнай кухняй кожнай краіны-ўдзельніцы, кантактавалі, праводзілі псіхалагічныя трэнінгі, гульні на знаёмствы. Акрамя гэтага, кожную раніцу праводзілася лінгвістычная анімацыя. Трэба было падыходзіць да прадстаўніка іншай краіны і сказаць яму што-небудзь на яго роднай мове. Такім чынам мы выказвалі павагу да сваіх сяброў, вучылі нямецкую і французскую мовы. Наогул, увесь гэты час назіралася салянка: спалучэннем нямецкай, рускай, беларускай, французскай і англійскай моў была перапоўнена атмасфера. Вялікую ролю адыгрывалі эмоцыі, міміка, жэсты. Часта нават без слоў разумелі, што каму было патрэбна.

— Сумесная праца мяняе кожнага да лепшага, — перакананы Яраслаў. — Я не першы раз удзельнічаю ў такіх абменах. Заўважыў, што калі людзі нейкі час ідуць да адзінай мэты, то зносіны паміж імі грунтоўна мяняюцца. Яны становяцца ветлівымі, клапоцяцца адзін аб адным. Напрыклад, напярэдадні паездкі ў Францыю я быў у Крыме. Там згубіў сумку. Быў здзіўлены: група хвалявалася больш, чым я.

Табу на алкагалізм, беднасць, багацце, адзіноту, штучнасць, дыстанцыю ў сям'і. Забароны бываюць рознымі. Бываюць гаючымі: за здзіранне кары з дрэў у Швецыі можна атрымаць вялікі штраф з канфіскацыяй асабістай маёмасці. Бываюць і знішчальнымі: адна з забаронаў у індусаў — табу на выратаванне чалавека, што тоне ў Гангe. Табу залежаць, у першую чаргу, ад грамадства, у якім чалавек жыве. Але тым не менш кожны павінен спрабаваць самастойна вызваляць чачавіцу ад пустазелля.

**Надзея ДРЫЛА.**

# Дыпламаваныя маці
# РАЗБУРАЮЦЬ СТЭРЭАТЫПЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Даводзіцца здымаць кватэру, бо інтэрнат даюць толькі ў тым выпадку, калі муж таксама студэнт БДУ, а мой ужо адвучыўся. Ён многа заняты на працы, таму пра размеркаванне хатніх абавязкаў няма гаворкі, робіць што можа. Валерыя сумуе, а калі бацька нарэшце з'яўляецца — яна забываецца нават на маму. Першае вымаўленае ёю слова было «тата».

***— Як ідзе падрыхтоўка дысертацыі?***

— Пішу пра міжнароднае права, аднабаковыя акты дзяржаў. Каб абараніцца, трэба сур'ёзна рыхтавацца. Калі ўсё атрымаецца — буду працаваць выкладчыкам у БДУ.

***— Вы ўсё паспяваеце — і прыгатаваць, і прыбраць, і павучыцца. Які ў вас парадак дня?***

— Дакладнага раскладу няма. Раней было так: дачка днём спіць — я займаюся навуковай працай, прачынаецца — я з ёю, зноў засынае — я зноў за камп'ютар, пішу, пакуль мазгі не адключацца. Зараз яна пайшла ў садок, стала лягчэй.

***— Ці задаволены памерам дапамогі?***

— У параўнанні з Расіяй сума значна большая. Хапае хаця б аплаціць дзіцячы садок.

***— БДУ чымсьці дапамагае?***

— Так, падтрымка ўніверсітэта заўсёды адчуваецца, ведаеш — ты не адзін, не сам-насам са сваімі праблемамі. Студэнтам-бацькам афіцыйна дазволена вольнае наведванне, ёсць магчымасць адпачыць разам з дзіцем ва ўніверсітэцкім санаторыі. Ёсць і маленькія радасці, вось як гэтае свята ці штогадовае запрашэнне дзяцей на навагоднюю ёлку.

## Завочная адукацыя для немаўлят

Здольнасці чатырохгадовай Жэні здзіўляюць выхавацеляў у дзіцячым садку. Мажліва, дзякуючы таце, кантрабасісту і студэнту трэцяга курса кансерваторыі, у дзяўчынкі цудоўнае адчуванне музыкі. Мама, Таццяна Кісялеўская, якая вучыцца на 5 курсе геаграфічнага факультэта БДУ, верыць у праўдзівасць паказкі пра тое, што дзеці студэнтаў — самыя разумныя і таленавітыя.

— Пакуль дачка не пайшла ў садок, выратоўвала толькі тое, што мы з мужам вучыліся ў розныя змены. Часам яму прыходзілася браць Жэню з сабой на рэпетыцыі, яна слухала сімфанічны аркестр. А падчас маіх экзаменаў гуляла па геаграфічным факультэце (ёй тут падабаецца, часта сама просіць — мама, пойдзем на геафак). Зараз яна робіць поспехі ў танцах і маляванні, нават не ведаем, што выбраць, і займаемся з ёю ўсім пакрысе.

Алеся Алесіна падчас практыкі на трэцім курсе геаграфічнага факультэта мусіла намаляваць карту, у чым яе вялікі жывот добра замінаў. Па начах дзяўчына сядзела з тушшу і пер'ямі, рабіла адмыслую колеры:

— Калі сын пайшоў у яслі, настаўніца малявання не магла паверыць, што Уладзіслаў ніколі раней не трымаў аловак — так упэўнена хлопчык яго ўзяў. Ён малюе такія роўныя колы...

## Раней — лепей!

Рэктар БДУ Васіль Стражаў, адзін з ініцыятараў свята, парадаваўся колькасці мнагадзетных мам студэнцкага ўзросту, ухваліў тэндэнцыю павелічэння такіх мам і ў маштабах краіны і ў БДУ ў прыватнасці:

— З тымі праблемамі, якія ў мам узнікаюць, хай звяртаюцца да нас. Напружвайце нас часцей, мы пойдзем насустрач ва ўсім, асабліва што датычыць арганізацыі ўніверсітэцкага жыцця. Многае зроблена. Напрыклад, бацькоў-студэнтаў не з Мінска забяспечваем жыллём такім чынам, каб не разлучаць сям'ю, дазваляем маладым мамам і татам вольнае наведванне. Калі можам, калі ёсць патрэба — дапамагаем.

***— Наколькі студэнты заахвочаны нараджаць дзяцей?***

— Заахвочвае іх дзяржава. На мой погляд, зараз ствараюцца ўсе ўмовы для таго, каб сем'і не толькі хацелі мець многа дзяцей, але і хацелі гэтага як мага раней. Я стаў бацькам у 24 гады, калі вучыўся ў аспірантуры. Каб тады існавалі падобныя сустрэчы і на іх запрашалі татаў, я б патрапіў. Але мушу прызнаць — штодзённыя праблемы, вучоба часам замінала атрымаць асалоду ад шчасця бацькоўства, назірання таго, як на тваіх вачах расце маленькі чалавечак.

***— Догляд дзіцяці, пэўна, замінае студэнтам сканцэнтравацца на вучобе. Вы не супраць таго, каб студэнты заводзілі дзяцей?***

— Наадварот, я цалкам за! Асабліва вітаю, калі ў студэнткі ўжо ў дваццаць гадоў ёсць дзіця, чым раней — тым і для сям'і, і для дзяржавы лепей.

## Галоўнае — самарэалізацыя

Таццяна Лісоўская з гістарычнага факультэта мае статус шматдзетнай мамы. Маленькія Паліна, Алесь і Мікіта дапамагаюць ёй разбураць стэрэатыпы:

— Мне даводзіцца змагацца з уяўленнямі пра маці, якая прысвячае сябе выключна дзецям, побыту. Часта сутыкаюся з такой сітуацыяй: тэлефаную, прадстаўляюся, кажу, што ў мяне трое дзетак — і адчуваю, як у слухача ўзнікае вобраз жанчыны сярэдніх гадоў, з авоськамі, у халаце і бігудзі. Досыць негатыўны вобраз, пагадзіцеся. Пры асабістай сустрэчы мне не вераць, што ў мяне дзеці і да таго ж я вучуся... Бог стварыў чалавека як шматгранную асобу, мацярынства — гэта толькі адна з граняў. Мы, мамы, павінны прысвячаць сябе дзецям — гэта недзе 60-80 % нашага прызначэння. Але трэба рэалізаваць сябе і ў прафесійным плане, і ў іншых сферах жыцця. Дзеці — гэта тое шчасце, якое напаўняе сіламі, дазваляе, нягледзячы на фізічную стому, працягваць самарэалізацыю.

## «Нарадзіце тройню — і атрымайце бясплатную няню...»

Такім чынам інфармуе і адначасова агітуе маладых маці намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны краіны Марыяна Шчоткіна. Сапраўды, не кожная жанчына, якая падарыла жыццё адначасова траім дзеткам, ведае, што па закону мае права на бясплатную няню. Акрамя гэтага, у нашай краіне жанчына, якая здзейсніла подзвіг — нарадзіла пяцёра дзяцей, узнагароджваецца Ордэнам маці і спецыяльнай грашовай прэміяй у памеры пяці бюджэтаў пражытачнага мінімуму. У дадатак да гэтага, гераіні атрымліваюць пэўную матэрыяльную падтрымку з мясцовага бюджэту (да прыкладу, у Мінску такім маці даецца права на бясплатны праезд на любым відзе транспарту на працягу года).



— Ад складаных сітуацый у нашым жыцці ніхто не застрахаваны, — працягвае інфармацыйна падкоўваць маладых маці Марыяна Шчоткіна. — Добра, калі побач знаходзяцца людзі, якія могуць дапамагчы. А што рабіць, калі апынуўся з праблемай сам-насам?.. Найперш звярніцеся ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Ён маецца ў кожным раёне. Там ёсць юрыст, псіхолаг, які бясплатна падкажа, што рабіць, спецыяліст, які ананімна дапаможа знайсці выйсце са складанай сітуацыі.

Дзяржаўная палітыка будуецца ў адносінах да жанчын па трох накірунках: падтрымка сям'і і мацярынства, умацаванне сям'і, стварэнне ўмоў для самарэалізацыі.

Сярэдні душавы прыбытак студэнцкіх сем'яў часам ніжэйшы за бюджэт пражытачнага мінімуму. Калі ўзяць сям'ю, якая складаецца з двух студэнтаў ці аспірантаў і дзіцяці (нават аднаго), то зразумела, што выключна на стыпендыю не пражывеш. У сувязі з гэтым сёння дзяржава аказвае дапамогу.

Незалежна ад прыбытку сям'і кожная жанчына атрымлівае матэрыяльную падтрымку ў выглядзе аднаразовай дапамогі пры нараджэнні дзіцяці (пяць бюджэтаў пражытковага мінімуму, ці сем бюджэтаў пражытковага мінімуму пры нараджэнні трэцяга дзіцяці) і штомесячную дапамогу ў памеры 65 працэнтаў бюджэту пражытачнага мінімуму (сёння разглядаецца законапраект аб павышэнні дапамогі з 1 студзеня да 80 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму). Пры гэтым не мае значэння, працуе маці ці вучыцца.

На базе тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва выплачваецца дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога. Яна ўяўляе сабой розніцу паміж бюджэтам пражытачнага мінімуму і крытэрыям патрэбнасці (ён зараз складае 60 працэнтаў ад бюджэту пражытачнага мінімуму). Дарэчы, разглядаецца праект аб павышэнні крытэрыяў патрэбнасці.

Паляпшэнне жыллёвых умоў паза чаргой — яшчэ адна перавага мнагадзетных сем'яў. Льготы ёсць і пры атрыманні крэдыту (калі нараджаецца трэцяе дзіця — 50 працэнтаў, чацвёртае дзіця — 70, пятае — 100 працэнтаў). Зараз, улічваючы тое, што многія маладыя сем'і не могуць атрымаць льготны крэдыт, разглядаецца законапраект аб пагашэнні не льготнага крэдыту.

## Паважайце правы мам

— Я жадаю, каб у вас былі дзеткі, а не бедкі, — звярнуўся да маладых матуль намеснік старшыні Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман Дапіра. — Са сваімі пытаннямі прыходзьце не толькі ў Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання. Ведайце, дзверы прафсаюза для вас заўсёды адчынены.

Раман Восіпавіч нагадаў, што на працягу навучальнага года кожны трэці чацвер месяца ў галоўным корпусе БДУ дзейнічае кансультацыйны пункт:

— Прафсаюз аказвае падтрымку, як маральную, так і матэрыяльную, маладым бацькам. Калі ў студэнтаў, якія з'яўляюцца членамі арганізацыі, нараджаецца дзіця, яны могуць напісаць заяву на матэрыяльную дапамогу. Зараз яна складае прыкладна 90 тысяч беларускіх рублёў. Акрамя гэтага, прафсаюзная арганізацыя кантралюе прызначэнне стыпендыяльных выплат для маці-студэнтак. Не заўсёды яны паспяваюць здаць усе залікі ў час, і не заўсёды дэканаты валодаюць інфармацыяй, як правільна прызначыць стыпендыю ў той ці іншай сітуацыі. Зараз тры ВНУ горада Мінска стаяць у нас на кантролі па праблеме стыпендыяльнага забеспячэння. Сярод іх БДУ, БДПУ, БНТУ. Наша задача — не дапусціць парушэння правоў студэнтак.

Паводле слоў Рамана Дапіры, для наймальніка браць на работу маладога спецыяліста — жанчыну (будучую маці) — лішні клопат. Каб удасканаліць сістэму найму, прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі сумесна з Міністэрствам адукацыі распрацавалі шэраг палажэнняў, якія даюць гарантыю занятасці маці.

Паводле пагаднення ў выпадку заканчэння тэрміну кантракту ў перыяд цяжарнасці, адпачынку па цяжарнасці і родах, а таксама адпачынку па догляду дзіцяці да трох гадоў наймальнік абавязаны са згоды работніка прадоўжыць тэрмін працоўнай дамовы да дасягнення дзіцем пяці гадоў. Акрамя гэтага, наймальнік не мае права заключаць кантракт з цяжарнымі жанчынамі, жанчынамі, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў (дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў), працоўныя дамовы з якімі былі заключаны на нявызначаны тэрмін, калі яны не далі згоды на заключэнне такіх кантрактаў.

**Надзея ДРЫЛА,**
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ.**
**Фота Надзеі ДРЫЛА.**

Экстрэмальныя гульні

# Прадзедавы лапці і кашуля-вышыванка дапамаглі перамагчы ў кулінарным конкурсе

**«...А чаму ўласна ля печы павінна абавязкова быць гаспадыня? А гаспадар чым горшы, я, напрыклад? Я сваю печ, каб вы ведалі, спецыяльна для такога выпадку загадзя адрамантаваў, пафарбаваў. А вы кажаце — гаспадыня! Няхай у маю хату таксама прыходзяць!». Так або прыкладна так даводзіў арганізатарам чарговага этапа «Уладар печы» сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар вёскі», што праходзіць у Глыбоцкім раёне, адзін дзядуля. Справа ў тым, што для правядзення кулінарнага конкурсу трэба было загадзя адшукаць і дамовіцца з гаспадынямі дзесяці рускіх печаў наконт іх (і печаў, і гаспадынь) удзелу ў гэтым этапе гульні. З гэтай мэтай старшыні сельскагаспадарчага прадпрыемства і сельскага Савета ў пошуках патрэбнага аб'ехалі ўсё наваколле. У выніку не адмовіў ніхто з «печаўладальнікаў», у ліку якіх былі і два мужчыны (дзядуля дабіўся-такі свайго!).**



**Сям'я Шарабайкаў — пераможца этапа.**

Пэўнай інтрыгай гэтага конкурсу было тое, што ніводная сям'я-ўдзельніца праекта (нават вясковая) дагэтуль ежу ў гэтай печы ніколі не гатавала. Так, многія бачылі, як тое рабілі іх бабулі-дзядулі, у пэўнай тэарэтычнай ступені ведалі, як што выконваць, але каб на практыцы — ад распальвання да чыгункоў ці патэльні з прыгатаванымі стравамі, як кажуць, з пылу-жару ды на стол — не, тое для ўсіх было ўпершыню. Нібы «хрышчэнне», бо і гатаваць трэба было стравы выключна нацыянальнай кухні.

Улічваючы ўсё гэта, умовы этапа можна было б назваць даволі жорсткімі. У прыватнасці, сям'і за тры гадзіны трэба было цалкам прыгатаваць сялянскі абед з трох страў (гаспадыні печаў толькі паківалі галовамі, маўляў, адразу бачна, што ніхто ніколі рускай печчу не карыстаўся, бо, каб ежа атрымалася як след, трэба больш часу; забягаючы наперад, скажам, што адной сям'і было ўвогуле складана распаліць печ, другая перакуліла на полымя чыгунок з бульбай). Дапамога старонніх людзей забаранялася. Чыгункі, патэльні, відэльцы, лыжкі і іншае неабходнае давалі гаспадыні печаў, але аб'ёму прыгатаванай стравы павінна было хапіць для дэгустацыі на 30 чалавек. Прадукты з сабой можна было браць толькі ў натуральным выглядзе, выкарыстанне загадзя адвараных, нарэзаных і г.д. забаранялася. Трэба было не толькі за азначаны час прыгатаваць сялянскі абед, але і сервіраваць стол з выкарыстаннем глінянага посуду, драўляных лыжак, абрусаў і сурвэтак. Але, бадай, галоўнае (акрамя ўласна прыгатавання), дык гэта пры падачы страў рэкамендавана было выкарыстоўваць, з аднаго боку, «форму адзення», якая б адпавядала выбранаму вобразу, з другога — дапаўняць прэзентацыю народнымі песнямі, вершамі, музычным суправаджэннем.

За кожны этап (умовы прыгатавання, смакавыя якасці стравы, сервіроўка стала, падача страў) можна было атрымаць штрафныя балы, якія маглі ў выніку аказаць уплыў на канчатковы вынік усяго этапа.

— Увогуле мушу зазначыць, што на працягу ўжо чатырох нашых праектаў кулінарны конкурс з'яўляецца для ўсіх самым любімым. Не хачу асабліва хваліцца, але ён заўсёды праходзіць на вельмі высокім узроўні, — кажа адзін з арганізатараў праекта, дырэктар народнага сямейнага клуба «Востраў разумення» маладзёжнага цэнтра аддзела адукацыі Глыбоцкага райвыканкама Марына Гараповіч. — У немалой ступені спрыяе гэтаму дастаткова строгае, але справядлівае журы. На гэты раз ролю суддзі выконвала майстар вытворчага навучання мясцовага прафліцэя Ніна Уладзіміраўна Жынь. Нават ёй, прафесіяналу, думаю, цяжка было ў нейкай ступені зрабіць свой выбар, прынамсі, штрафныя балы былі зусім маленькімі — літаральна 0,2—0,5 бала. А ўсё таму, што ўсе прыгатаваныя стравы сапраўды былі вельмі, вельмі смачнымі! Каб вы ведалі, які пах ад іх стаяў!..

Трэба сказаць, што гэты этап праекта праходзіў на базе філіяла «Прошкава» ААТ «Глыбоцкі аграсэрвіс» (кіраўнік Мікалай Аляксандравіч Лаўцэвіч). Напачатку транспартам гаспадаркі ўсіх удзельнікаў развезлі да «сваіх» печаў, у канцы конкурсу (разам з прыгатаванымі стравамі) сабралі ўсіх разам. На дэгустацыю, вядома. Тут ужо ролю «афіцыянтаў» (ніякай двухсэнсоўнасці, паспрабуй ты без звычкі пацягай цяжкія і гарачыя чыгункі!) выконвалі члены мясцовай «пярвічкі» БРСМ (сакратар Вольга Сабыніч). Але ўсё па парадку...



**Стол ад сям'і Зайкоўскіх.**

Гавораць, ад паху страў, што гаталіся, ва ўсіх літаральна слінкі цяклі. Вядома, часу было малавата, як заўважалі гаспадыні (і гаспадары!) печаў, тым не менш усё атрымалася проста цудоўна! Мяркуйце самі. Сям'я Шарабайкаў прыгатавала (падкрэсліваю зноў — у рускай печы) крупнік з пеўня, бульбяную бабку, кампот; сям'я Свілёнкаў прапанавала кіслую капусту з рулькай у якасці першай стравы, бульбянікі з грыбным соусам — другой, і ўзвар з сухой садавіны з мёдам. Сям'я Зайкоўскіх прыгатавала грыбны суп, бульбяную бабку і гарбату з мяты і чабору (асабліва пахваліла гаспадыня апошнюю сям'ю — тут гатаваў муж; увогуле ж усім сваім «падапечным» гаспадары печаў не шкадавалі кампліментаў). Пералічаныя сем'і адпаведна занялі першае, другое і трэцяе месцы.

А калі падоўжыць «смачную» тэму, сем'ямі-ўдзельніцамі былі яшчэ прыгатаваны дзве стравы са шчаўя (розныя на смак), бульбяныя клёцкі, калдуны... Уяўляеце, якую потым сумесную «паляну» арганізавалі?!

— Ну а чарка пад такую смакату потым была? — пытаюся ў Валеры Шарабайкі — главы сям'і, якая ў кулінарным конкурсе за ўсе этапы атрымала ад суддзяў максімальную колькасць балаў і стала пераможцам.

— Было трошкі, — смяецца той. Пра конкурс ён расказвае па-мужчынску нешматслоўна, маўляў, печ як печ, хоць гатаваць у ёй давялося ўпершыню ў жыцці.

— Чым уразіла яшчэ гэта сям'я, дык гэта сапраўдным нацыянальным адзеннем і абуткам, якія дасталіся ад продкаў. Гэтыя сапраўдныя рэчы — кашуля і лапці — напэўна, дапамагалі сваёй энергетыкай, яе адчулі многія, — падказвае Марына Гараповіч.

— Так, лапці некалі належалі прадзеду, думаю, ім не менш за 120 гадоў. Знайшоў я іх на гарышчы дома, дзе некалі жыў дзед, — пацвярджае Валера. — Гэты старадаўні абутак сапраўды ўсім спадабаўся, мяне многія нават прасілі, маўляў, дай лапцяў на танцы схадзіць! А калі сур'ёзна, дык іх хацелі б забраць у наш мясцовы краязнаўчы музей. Кашуля таксама сапраўдная, саматканая. Некалі ж лён самі вырошчвалі, палатно рабілі. Праўда, яна значна «маладзейшая» за лапці.

Валера Шарабайка і яго жонка Ірына некалі разам працавалі ў СВК «Пятроўшчына», зараз жа глава сям'і перайшоў на Глыбоцкую райплемстанцыю, гаспадыня — у раённую інспекцыю па каранціне і ахове раслін. Гадуюць сына Мікіту, які зараз ходзіць у другі клас. Дарэчы, ён таксама ўдзельнічаў у кулінарным конкурсе, дапамагаў тату і маме чым мог.

Калі ж гаварыць увогуле аб усім праекце, дык па выніках апошніх 13 этапаў лідзіруе сям'я Герасімёнкаў (яна ўжо сёмы ці восьмы раз запар займае першы радок «хіт-парада»). У мінулы раз мы падрабязна пісалі пра сумесныя дасягненні гаспадыні Маргарыты (заатэхніка СВК «Ломашы-Агра»), гаспадара Віктара (электрамеханіка Полацкай дыстанцыі сігналізацыі і сувязі Беларускай чыгункі) і іх дзетак — Настасіі і Яўгена. Другую прыступку «п'едэстала» дзеляць сем'і Сурвілаў (Сяргей і Вольга з сынам Уладзіславам) і Грабко (Таццяна і Рыгор з дачкой Ірынай). Чацвёртае (але не апошняе) месца за сям'ёй Пашкевічаў (Анатолем і Алёнай і іх трыма дзеткамі). Наступны этап павінен адбыцца ў вёсцы Галубічы — на базе філіяла «Галубічы» ААТ Глыбоцкі мясакамбінат (кіраўнік Віктар Уладзіміравіч Клімаў). Напачатку планавалася, што гэта будзе конкурс грыбнікоў, але прырода сёлета дарамі лесу не вельмі парадавала. Таму тут плануецца правесці конкурс народных рамёстваў і промыслаў. Этап пройдзе ўжо ў гэтыя выхадныя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота Марыны ГАРАПОВІЧ.**

### ЗАКРЫЛІ ТУРЫСТЫЧНЫ СЕЗОН

Пры падтрымцы Наваполацкага гаркама БРСМ на турбазе «Янава» прайшла акцыя для працоўнай моладзі, прысвечаная закрыццю турыстычнага сезона.

Каманды бралі ўдзел у эстафеце, пераадольвалі турыстычную паласу перашкод, абменьваліся вопытам арганізацыі цікавых паходаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Муз-news

### ВЫКОНВАЮЧЫ АБЯЦАННЕ

**Спявак Аляксандр Патліс, які ўваходзіць у «Зорную каманду», сфарміраваную ў Беларусі для барацьбы са СНІДам, паабяцаў дапамагаць ВІЧ-інфіцыраваным дзецям. І нядаўна гэта сваё абяцанне пацвердзіў — даў сумесна з нямецкім музыкантам Дэні Плэтам дабрачынны канцэрт «Чыстае сэрца». Частка сродкаў, атрыманых ад канцэрта, будзе накіравана на лекі і іншыя неабходныя рэчы для хворых дзяцей.**

Акрамя таго, падчас акцыі гледачы маглі выказаць сваё стаўленне да праблемы СНІДу з дапамогай SMS-паведамленняў, што трансляваліся на вялікім экране на сцэне. Усяго было атрымана больш як 100 паведамленняў са словамі падтрымкі і пажаданнямі быць моцнымі духам. Дый самі музыканты, акрамя матэрыяльных, зрабілі творчыя падарункі: Аляксандр Патліс выканаў свае вядомыя хіты і новыя песні «Я бачу цябе» і «Распятая каханне», а песні Дэні Плэта былі прысвечаны духоўнаму сталенню і адмове ад наркотыкаў.

Праект «Чыстае сэрца» стартаваў восенню 2006 года, з поспехам прайшоўшы ў сямі гарадах рэспублікі. Тады прыбыткі ад канцэртаў былі пералічаны на рахунак рэабілітацыйнага цэнтра ў Баранавічах, медыкаменты і аперацыі для дзяцей з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі ў Брэсце, падарункі для дзіцячага сацыяльнага прытулка ў Оршы і аздараўленчага летніка ў Магілёве.

### «ФАБРЫКА ЗОРАК» ПА-ЛАТЫШСКУ

**15 кастрычніка ў Юрмале стартавала міжнароднае тэлешоў «Hallo, Jurmala», падобнае па фармату да праекта «Фабрыка зорак». Удзел у шоў бяруць 12 канкурсантаў з розных краін, у тым ліку з Беларусі — нашу рэспубліку прадстаўляе спявачка Мілана.**




Шоў працягнецца 9 месяцаў. За гэты час удзельнікам трэба будзе, займаючыся з педагогамі і ўлічваючы заўвагі прадзюсара, заваяваць сімпатыі тэлегледачоў з Расіі, Украіны, Беларусі, Італіі, Іспаніі, Швецыі, у якіх таксама транслюецца конкурс. Тройчы на дзень паказваюцца «дзённікі» рэпетыцый і закуліснага жыцця, а па суботах — справаздачны канцэрт (першы з іх адбудзецца ўжо 20 кастрычніка). 8 чэрвеня 2008 года шоў фінішуе ў канцэртнай зале «Дзінтары», дзе і будуць названыя пераможцы праекта.

Паводле слоў Міланы, па ўмовах «Хэло, Юрмала» крыху адрозніваецца ад «Фабрыкі зорак» — у сэнсе большай свабоды для канкурсантаў. Можна колькі заўгодна тэлефанаваць родным і сябрам, можна з першых жа канцэртаў трапіць у фінал шоў — калі вельмі спадабаешся прадзюсарам. На працягу месяца такім чынам у праект могуць трапіць да васьмі новых удзельнікаў. Словам, шанц ёсць ва ўсіх — былі б талент і ўпартасць...

### «БЕЛАРУСКАЕ ЗОЛАТА» Ў ІНТЭРНЭЦЕ

**Гурт «J:Морс» збіраецца ўсё-ткі парадаваць прыхільнікаў і выпусціць у лістападзе новы альбом — упершыню ў гісторыі калектыву ён выйдзе цалкам на беларускай мове.**

А каб было не так цяжка і сумна чакаць, папярэдне, 17 кастрычніка, музыканты прадставілі сінгл «Беларускае золата» — дзве версіі адной песні, студыйная і канцэртная (прагучала напрыканцы верасня ў Віцебску). Данесці ж да слухачоў матэрыял вырашылі самым дэмакратычным шляхам — праз Інтэрнэт.

Песню «Беларускае золата» Уладзімір Пугач напісаў усяго месяц таму — як прызнаецца, за адзін дзень, пад уражаннем ад «залатой восені». «Напэўна, апошні раз такое было тры гады таму, калі літаральна за некалькі дзён з'явілася і была запісана «Разам назаўжды», — прыгадвае лідар калектыву.

У будучы альбом, як плануюць музыканты, трапіць толькі студыйная версія песні. Пакуль жа можна скачаць абодва варыянты — прычым не толькі на афіцыйным сайце гурта, але таксама на сайтах партнёраў праекта www.telecom.by і www.tut.by.

**Вядучая рубрыкі**
**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

### ДУЭЛЬ — НА КУХНІ

Як, скажыце, можна выхаваць у студэнтаў карпаратыўны дух і прывучыць да самастойнага жыцця маладых людзей, якія яшчэ ўчора знаходзіліся пад поўнай бацькоўскай апекай? У Беларускім дзяржаўным універсітэце вырашылі арганізаваць для гэтага «Кулінарны паядынак», удзел у якім ўзялі восем камандаў з інтэрнатаў Студэнцкага гарадка, якія прадстаўлялі ўсе курсы і ўсе факультэты. Удзельнікам спаборніцтваў было прапанавана з аднолькавага набору прадуктаў прыгатаваць за адну гадзіну страву, эстэтычна яе аформіць і прыдумаць ёй назву. Пераможцы атрымалі дыпломы і памятныя падарункі ад адміністрацыі студгарадка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### ЛЕПШЫ ПА ПРАФЕСІІ

Віцебскі райкам БРСМ стаў адным з арганізатараў конкурсу «Лепшы па прафесіі» сярод маладых механізатараў. Каля 40 чалавек на спецыяльнай пляцоўцы на базе ЗАТ «Ліпаўцы» прадэманстравалі сваё прафесійнае майстэрства. Лепшыя былі адзначаны памятнымі прызамі.

У Аршанскім раёне райкам БРСМ дапамог правесці спаборніцтвы сярод маладых механікаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### «СВІНСКІЯ ВЫБРЫКІ»

Галоўную ўзнагароду IV Міжнароднага фестывалю студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар—2007» — прыз глядацкіх сімпатый — атрымаў спектакль тэатра-студыі «Сёмы паверх» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў «Свінскія выбрыкі». Пераможцу фестывалю вызначылі гледачы рэйтынгавым галасаваннем. Другое месца, згодна з ацэнкай гледачоў, заняў студэнцкі тэатр Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. Ламаносава, а трэцяе — народны тэатр «Сатрап» Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Перамогу ў намінацыі «Лепшая сцэнаграфія» і «Лепшая рэжысура» атрымаў спектакль «Шчаслівы няўдачнік» студэнцкага тэатра МДУ. А пастаноўка «Я кахаю» народнага тэатра «Жывое слова» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка стала пераможцай Інтэрнэт-галасавання, якое ўпершыню праводзілася на «Тэатральным куфры».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### СТВАРЭННЕ ЛЯЛЕК — ГЭТА МАСТАЦТВА

VI Рэспубліканская выстава аўтарскай лялькі «Балаганчык» адкрыецца 19 кастрычніка ў мастацкай галерэі Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці. Кожная такая выстава становіцца адкрыццём новых імёнаў і новых персанажаў у лялечным свеце. Сёлета ў рамках выставы запланавана прэзентацыя метадычнага фільма па вырабе лялек, а таксама правядзенне лекцый па лялечным дызайне. Азнаёміцца з экспазіцыяй «Балаганчыка» можна будзе да 25 лістапада.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### ЭКАЛОГІЯ І ДЗЕЦІ

**Свой новы даклад Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) прысвяціла экалагічным аспектам аховы здароўя дзяцей. Даследаванне правяла спецыяльная Кансультатыўная група ў складзе 24 навуковых экспертаў з 18 краін свету.**

Дзеці — гэта не маленькія дарослыя, лічаць эксперты. Яны зусім не так, як дарослыя, рэагуюць на фактары навакольнага асяроддзя. І гэта рэакцыя можа адрозніваецца ў залежнасці ад розных канкрэтных этапаў іх жыцця і развіцця. Так, напрыклад, іх лёгкія ў момант нараджэння (і нават пазней — у васьмігадовым узросце) з'яўляюцца яшчэ недастаткова развітымі. Таму на іх развіццё можа паўплываць забруджанасць паветра. Яно, дарэчы, становіцца прычынай вострых рэспіраторных інфекцый у дзяцінстве і можа прывесці да ўзнікнення хранічных рэспіраторных захворванняў на больш познім этапе жыцця.

Забруджанасць паветра і вады, прысутнасць пестыцыдаў у ежы, свінцу — у глебе, а таксама многія іншыя экалагічныя пагрозы аказваюць пастаяннае ўздзеянне на кволы арганізм дзіцяці. У выніку могуць узнікаць новыя або абвастрацца ранейшыя хваробы. Больш за 30 працэнтаў захворванняў сярод дзяцей можа быць звязана з фактарамі навакольнага асяроддзя.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Рэпарцёр атрымаў заданне...

# ...ПАТРАПІЦЬ У СЕТКУ ПА ЖАДАННІ

Я зноў саджуся насупраць прыгожай дзяўчыны Алены. Яна не ведае, што я журналіст. А я здагадваюся, што яна не размаўляла б так са мной, калі б ведала праўду. Гэта наша другая сустрэча. Алена пытаецца ў мяне пра жыццё, чым я займалася апошнія дні, ці разважала над прапановай працаваць у сеткавым маркетынгу.

Насамрэч я ўжо не ўпершыню на такой гутарцы, не ўпершыню чую тое, што мне кажа Алена. У сеткавы (ці шматузроўневы) маркетынг мяне запрашалі шмат разоў. Я ўжо ведаю, што гэта такое і як працуе. А вы яшчэ не? Выбачайце, зараз усё патлумачу.

Сеткавы маркетынг — гэта форма вядзення пазакрамавага гандлю. Фірма-вытворца набірае агентаў (дыстрыб'ютараў), якія знаходзяць патэнцыйных пакупнікоў. Прадаўшы тавар, агенты прапануюць гэтым пакупнікам знайсці новых на ўмовах атрымання нейкіх працэнтаў ад продажу. Такім чынам, будуецца піраміда, дзе ў кожнага пакупніка ёсць некалькі чалавек, таксама спажывальнікаў тавараў гэтай фірмы, з пакупак якіх ён атрымлівае нейкі працэнт. У гэтым ланцугу ніхто нічога не стварае, акрамя фірмы-вытворцы, але кожны зацікаўлены ў пошуку як мага большай колькасці пакупнікоў.



Вось такі бізнэс (а інакш людзі, да якіх я прыходзіла на гутарку, сваю працу не называлі). І сёння Алена зноў малюе схемы на паперы. Вось гэты кружочак — я. Калі падпісваю пагадджэнне і станаўлюся незалежным консультантам дадзенай фірмы, я павінна купіць тавару вось на такую суму, каб атрымаць скідку вось на столькі працэнтаў пры наступнай пакупцы. Расце колькасць маіх пакупак — расце працэнт скідкі.

«Заробак. Для тых, хто мае дзве-тры гадзіны вольнага часу...», «Праца для студэнтаў...», «Арганізацыя запрашае на працу. Галоўныя ўмовы: камунікабельнасць...». Вы бачылі такія аб'явы? Ведаеце, у мяне дэ-жавю: пяць разоў я тэлефанавала па нумарах, якія прыведзены ў падобных аб'явах, і пяць разоў потым чула пытанне «Што вы ведаеце пра сеткавы маркетынг?». Не верыце, але мне ўжо станавілася смешна.

Але, калі казаць без жартаў, такі бізнэс сапраўды можа прыносіць добрыя грошы. Напрыклад, вы пабудавалі сваю сетку так: знайшлі трох пакупнікоў, а кожны з іх яшчэ па тры і гэтак далей. Атрымалася такіх ліній, узроўняў недзе чатыры (колькасць пакупнікоў на кожным суадносна 3-9-27-81). Атрымліваецца 120 чалавек, з кожнай пакупкі якіх вы атрымліваеце недзе ў сярэднім 10 працэнтаў. Будзем лічыць, што тавар каштуе каля 20 долараў і кожны дыстрыб'ютар за месяц прадаў толькі па адзінцы тавару. Што атрымліваем? 240 долараў штомесяц. І сетка пры гэтым увесь час пашыраецца!
На адной гутарцы малады чалавек Дзіма дакладна растлумачыў мне схему ўваходжання ў піраміду кампаніі. Вось гэты кружочак (і чаму ўсе гэтыя дыстрыб'ютары так любяць маляваць кружочкі на паперы?) — я. А вось гэты — ён сам.

*З гісторыі. Сеткавы маркетынг з'явіўся ў ЗША напачатку XX стагоддзя. Пачынальнікам гэтага бізнэсу лічыцца Карл Рэнборг. Ён першы пабудаваў сетку спажывальнікаў-прадаўцоў тавараў здаровай ежы. 80-я гады сталі пікам развіцця сеткавага маркетынгу. Да такой схемы продажу звярнуліся тысячы кампаній. У Амерыцы і некаторых іншых краінах сёння каля 15 працэнтаў насельніцтва асноўнай дзейнасцю выбрала сеткавы маркетынг.*

Юнак запрасіў мяне ў створаную ім сетку, я падпісваю пагадджэнне і трапляю ў картатэку. Там ёсць партфель Дзімы, у якім ствараецца мая папка. З гэтага часу кожнага новага пакупніка сваёй сеткі я павінна зарэгістраваць у сваёй папцы Дзімінага партфеля. Прыйсці ў сетку самастойна нельга, толькі праз іншага агента. Супрацоўнікам фірмы-вытворцы я не станаўлюся. Зарплату атрымліваць не буду — толькі тыя грошы, што набуду з продажу. На рэкламу, распаўсюджванне тавару, заклік новых супрацоўнікаў трэба браць са сваёй кішэні. Графік будую сама. Працоўны стаж мне таксама не ідзе. Спецыяльная праграма вылічвае колькасць працэнтаў з продажу кожнага чалавека маёй сеткі. Гэты працэнт павялічваецца, калі я сама карыстаюся прадуктамі дадзенай фірмы.

Зразумела, што сеткавы маркетынг — гэта сфера гандлю. Калі вы можаце і хочаце займацца гэтым, уважліва пачытайце аб'явы ў горадзе, патэлефануйце і выкарыстайце свой шанц. Але памятайце, што гэтая дзейнасць неафіцыйная. Так, яна дазволена, не пярэчыць законам Беларусі. Але калі фірма скончыць супрацоўніцтва з нашай краінай, разваліцца і ваша сетка. Нельга забываць, што, адказнасць за якасць тавару датычыцца не толькі вытворцы, але і вас. Трэба разумець, што першапачаткова вы не будзеце атрымліваць ніякіх працэнтаў. Вы павінны не толькі знаходзіць пакупнікоў, але і набываць тавар. Толькі аддаўшы вытворцу нейкія грошы, вы атрымаеце скідку, пасля чаго пачняце збіраць працэнты са сваёй сеткі. Акрамя таго, нельга забываць і аб дзяржаве. Аб чым гэта я? Аб падатках.

Любы даход абкладаецца падаткам. Калі вы займаецеся сеткавым маркетынгам як фізічная асоба, то атрыманыя грошы павінны ўказваць у дэкларацыі аб сукупным гадавым даходзе (нават калі гэта не асноўная ваша дзейнасць). Калі гэта для вас сапраўды бізнэс і вы рэгіструецеся як прыватны прадпрымальнік, ёсць некалькі варыянтаў. Можна выкарыстаць спрошчаную сістэму падаткаабкладання. Сукупны гадавы даход не перабольшвае 600 млн рублёў ці 450 млн за апошнія 9 месяцаў папярэдняга года — прадпрымальнік павінен плаціць 10 працэнтаў ці 8 + ПДВ (падатак на дабаўленую вартасць). Другі варыянт — плаціць па звычайнай сістэме (Законе аб падаходных падатках). Калі сеткавым маркетынгам займаюцца асобы, якія не дасягнулі 18 гадоў, іх інтарэсы прадстаўляюць бацькі.

Я развітваюся з Аленай, як раней развіталася з Дзімам і іншымі дыстыб'ютарамі, і накіроўваюся да выхаду. Каля самых дзвярэй азіраюся. Дзяўчына сумна і задумліва глядзіць на мяне.

— Калі перадумаеш і захочаш прыйсці ў бізнэс, тэлефануй мне, так? Толькі больш нікому, добра? — просіць яна. Я выходжу. Мне падабаецца не проста прадаваць, але і ствараць.

**Настасся КАРАЦЕЕВА.**
**Фота аўтара.**

